**Вучэбная дысцыпліна “Асновы літаратурна-мастацкай дзейнасці”**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 – 0232-01 “Беларуская філалогія. Прафілізацыя”: літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць<br>кампанент установы вышэйшай адукацыі<br>модуль “Стылістычнае і літаратурнае рэдагаванне” |
| **Кароткі змест** | Эстэтыка як навука. Асноўныя эстэтычныя катэгорыі. Мастацтва ў грамадстве, яго функцыі і тыпалогія. Асноўныя галіны мастацкай літаратуры. Структура і сюжэтна-кампазіцыйная арганізацыя літаратурна-мастацкага твора. Стыль літаратурна-мастацкага твора. Творчы працэс.<br>Літаратурная крытыка і яе месца ў літаратурна-мастацкай дзейнасці.<br>Агульныя пытанні тэорыі літаратурна-мастацкай дзейнасці. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць**:<br>- змястоўнае напаўненне асноўных эстэтычных катэгорый і асаблівасці іх праекцыі на літаратуру як від мастацтва;<br>- тыпалогію мастацтва, спецыфічныя рысы літаратуры як віду мастацтва;<br>- склад і асаблівасці арганізацыі літаратурна-мастацкага твора, адметнасці літаратурных родаў, іх відаў і жанраў, сістэму вобразна-выяўленчых сродкаў;<br>- асноўныя складнікі і этапы творчага працэсу, вызначальныя кампаненты творчай лабараторыі пісьменніка;<br>павінен **умець:**<br>- вызначаць ролю і склад кампанентаў творчай лабараторыі пісьменніка;<br>- аналізаваць у гістарычным аспекце літаратурна-мастацкія творы з улікам іх зместу і формы;<br>- характарызаваць спецыфіку розных відаў мастацтва ў суаднесенасці з гісторыяй беларускай культуры;<br>- разумець і адлюстроўваць у практычнай дзейнасці спецыфіку родаў, іх жанраў і відаў мастацкіх твораў.<br>Патрабаванні да прафесійнай **кампетэнтнасці** спецыяліста:<br>СК-1. Тлумачыць феномен літаратурнай творчасці, яго месца ў сістэме складаных узаемасувязяў відаў грамадскай і культурнай дзейнасці людзей. |
| **Прэрэквізіты і пострэквізіты** | “Гісторыя беларускай літаратуры”, “Уводзіны ў літаратуразнаўства”, “Тэорыя літаратуры” |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін для дзённай формы навучання – 90; аўдыторная колькасць гадзін – 34, з іх: лекцыі – 20 (з іх кіруемая самастойная работа (КСР) – 6), практычныя заняткі – 14, заліковыя адзінкі – 3. |
| **Семестр, формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 4-ы семестр, тэст, залік |